Такім чынам, можна зрабіць наступны вывад: з дапамогай матэрыялу даследванняў па выяўленні нямецка-беларускіх моўных паралеляў настаўнікі змогуць распрацаваць інтэграваныя ўрокі беларускай і нямецкай моў. Такія ўрокі, па-першае, зробяць навучанне нямецкай мове больш эфектыўным і паспяховым. Таму што пад час інтэграваных урокаў беларускай і нямецкай мовы настаўнік атрымлівае магчымасць сканцэнтраваць увагу вучняў у першую чаргу на спецыфічных з'явах нямецкай граматыкі, тады як на вядомых з вопыту роднай мовы граматычны з'явах неабходна будзе спыняцца толькі ў аглядным плане, засяроджваючы ўвагу, напрыклад, на адметнасці тэрміналогіі. Па-другое, інтэграваныя ўрокі беларускай і нямецкай мовы дазволяць паказаць адметнасць, самабытнасць, каштоўнасць беларускай мовы, давесці, што «беларуская мова не саступае рускай і той замежнай мове, якая вывучаецца ў школе…і з'яўляецца такой жа прэстыжнай мовай» [2, с. 129]. Бо каб ведаць і паважаць мову іншага народа, патрэбна спачатку шанаваць і ведаць сваю родную.

**Літаратура**


1. *Выхота В. А.* Нямецка-беларускія моўныя паралелі. Мінск, 1999. (Энцыклапедыкс).
2. *Выхота В. А.* Нямецка-беларускія моўныя паралелі ў методыцы выкладання моваў // Беларуска-нямецкае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучаснасць, перспектывы: матэр. Міжнар. «круглага стала». Мінск, 1996. Кн. 7. С. 129-135.
3. *Шанский Н. М.* Иностранные языки на уроках русского языка // Русский язык в школе. 1997. №1. С. 3-10.
4. *Шуман Е. В.* Учет специфики грамматики немецкого языка в учебном процессе // Иностранные языки в школе. 2006. №4. С. 93-98.


## СІМВОЛІКА-АЛЕГАРЫЧНАЯ ВОБРАЗНАСЦЬ «СЛОВА НА САБОР СВЯТЫХ АЙЦОЎ 300 І 18...» КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА


**В. М. Бурак**


Традыцыйнасць і сімвалічнае светаадчуванне належаць да ліку вядучых эстэтычных прынцыпаў мастацкага метаду старажытнай літаратуры, гэта найважнейшыя сістэмастваральныя фактары яе паэтычнай вобразнасці, умова функцыявання вобразаў-сімвалаў. Традыцыйныя стылістычныя сродкі сярэднявечнай кніжнасці адыгрывалі вызначальную ролю ў мастацкім афармленні тэксту твора і рэцэпцыі яго чытачом-слухачом. Д. С. Ліхачоў у дачыненні да старажытнай літаратуры заўважыў: «ўсё поўна таемнага сэнсу, таемных сімвалічных суадносін з Пісаннем» [3, с. 159]. Па ўяўленнях сярэднявечнага кніжніка, падзеі гісторыі, як рэальнай, так і сакральнай біблейскай, навакольнае асяроддзе, з'явы прыроды з'яўляюцца толькі знакамі, якія неабходна

прачытаць, а мэта чалавечага пазнання палягае ў тым, каб дэшыфраваць іх сімвалічнае значэнне.

Сярод самых значных і базісных сакральных вобразаў-сімвалаў у эстэтычнай сістэме каштоўнасцей «Слова на Сабор святых айцоў 300 і 18...» Кірылы Тураўскага вылучаецца дыхатамія «дабро – зло». Гэтыя фундаментальныя універсальныя духоўныя катэгорыі пабудаваны ў творы па прынцыпу дуальных апазіцый «каштоўнасць – антыкаштоўнасць», «святасць – грахоўнасць», якія ў поўнай меры раскрываюцца праз сімволіку, з аднаго боку, Святой Тройцы, з другога – праз вобраз-сімвал д'ябла.

Святая Тройца сімвалізуе трохмернасць месца, часу і прасторы і з'яўляецца самым поўным апісаннем усеахопнага свету ў сэнсе хрысціянскага вучэння. Гэтыя тры аспекты існуюць незалежна адзін ад аднаго, але, нягледзячы ні на што, рэпрэзентуюць адзінага Бога, які праяўляецца як сімвал трыадзінства Бога-Айца, Бога-Сына і Святога Духа: «*...претять тя пророци, Святымь Духомь гласнее трубы поведающе, яко Христос есть Сын Божий, Бог и человек и присно Бог, сияние славы и образ невидимаго Бога*» [4, с. 370]. Такое разуменне Святой Тройцы было прынцыповым у «Слове на Сабор…» Кірылы Тураўскага, бо непасрэдна працавала на ідэйную арыентацыю твора: безапеляцыйна абвергнуць вучэнне Арыя пра не-Бога-Хрыста.

Сімвалам-алегорыяй Бога-Айца ў пропаведзі Тураўляніна з'яўляецца рука – творчая сіла Госпада: «*в руце Божии своя душа предамы*» [4, с. 372]. Святы Дух сімвалізуе ў хрысціянскай традыцыі пазнанне адзінства Бога і чалавека ў бясконцай любові.

Сакральнае паняцце «дабро» ў «Слове на Сабор…» святога Кірылы канкрэтызуецца праз канцэпты «чысціня» і «цнота», якія рэалізаваны ў сімвалах-алегорыях ангела і ягняці («агнца»). Ангелы у біблейскай традыцыі з'яўляюцца духоўнымі стварэннямі, праз якіх Бог выказвае сваю волю («ангел» у перакладзе з грэчаскай мовы – «вястун»), і таму сімвалізуюць служэнне, найвышэйшую духоўнасць, чысціню, заступніцтва: «*слова ангели*» [4, с. 369], «*посланаго к девей ангела*» [4, с. 370]. З вобразам ангела звязваюцца ўласцівасці сілы, энергіі, прыгажосці, дабрыні [6, с. 9–10]. «Агнец» выступае ў пропаведзі Кірылы Тураўскага ў якасці сімвала пакорлівасці і непавіннасці: «*...не дадуще вълку к агнецьм приближитися...*» [4, с. 371]. У біблейскай традыцыі сімвал ягняці звязваецца з ахвярапрынашэннем. У гэтага вобраза ёсць яшчэ адно значэнне: ягнятамі ці авечкамі ў «Слове на Сабор…» называюцца слабыя вераю людзі; яны прыпадабняюцца да паствы, якая ідзе за пастырам: «*Христова овчата*» [4, с. 368], «*стада не щадяще Христова*» [4, с. 369], «*добрии Христова стада пастыри*» [4, с. 371].

Семантычнае поле «зло» ў пропаведзі свяціцеля зададзена вобразам-сімвалам д'ябла: «*паче же рещи съсуд бе сотонин*» [4, с. 367], «*сам дьявол неподобьная глаголаше*» [4, с. 368], «*воевода сотонин*» [4, с. 368]. Д'ябал – вечны супраціўнік Бога. Усякі рух узнікае ад сутыкнення супрацьлеглых прынцыпаў; боскае дабро не магло б увайсці ў свядомасць чалавека без адмоўнага пачатку. Як вечны разбуральнік, д'ябал сімвалізуе эфемернасць, нявечнасць усіх зямных з'яў [1, с. 198–199].

Наступнай па значнасці ў сакральным полі «Слова на Сабор…» трэба адзначыць дыхатамію сімвалаў святло – цемра, якая выяўлена праз адпаведныя вобразы: «*изволи бо тьму паче, нежели свет*» [4, с. 368]. Традыцыйна святло ўпадабляецца духу і боскасці, паўстае як сімвал святасці, высакародства, прыгажосці, лічыцца выяўленнем мудрасці і дабрадзейнасці; у пропаведзі свяціцеля святло – атрыбут айцоў Нікейскага сабора, што нясуць існіннае вучэнне пра Хрыста. У Бібліі, якая з'яўлялася асноўнай крыніцай вобразаў і сімвалаў для Кірылы Тураўскага, святло трактуецца як увасабленне боскасці (Вых. 19). Светавая сімволіка Бога знаходзіць адлюстраванне ў метафары азарэння [6, с. 376].

Сімвалічнае значэнне цемры выкрываецца пры супастаўленні з сімволікай святла. У вобразе цемры, што суадносіцца з вучэннем Арыя, можна вылучыць два сэнсавыя пласты. З аднаго боку, цемра – гэта стан света-космаса да яго стварэння боскім пачаткам, суадносіцца з хаосам, з нявызначанасцю абрысаў, форм. Цемра – вобраз матэрыі да яе адухаўлення святлом, вышэйшым пачаткам. З другога боку, цемра мае месца існавання пасля стварэння-асвятлення космасу і яўляе сабою знак зла, вобраз пекла. Цемра у маральнай сферы звязана з недасканаласцю і парокам, у сферы інтэлектуальнай – з невуцтвам і цемрашальствам [6, с. 440–441].

Называючы святых айцоў Нікейскага Сабора «орламі», Кірыла Тураўскі мае на ўвазе строга тэалагічныя паняцці: «*...и скоро съвькупишася святи отци, ...ли яко орли опостольскым въкриливъшеся учениемь...*» [4, с. 368]. Арол – асабліва шануемая, божая птушка; ён цар птушак і валадар нябёсаў. Арол звязаны з нябеснымі стыхіямі і кіруе імі, што ўказвае на выключна кніжнае паходжанне гэтага вобраза-сімвала. Па павер'ях, арол здольны наведваць нябесны свет, ён жыве даўжэй за ўсіх птушак і валодае магчымасцю амаладжэння: біблейскі сімвал даўгавечнасці.

Вельмі цікавы і глыбокі па сваёй сутнасці сакральны хрысціянскі вобраз карабля: «*...святии отци, ...яко корабли пълин духовнаго богатьства...*» [4, с. 368]. Гэты вобраз непасрэдна звязаны з сімволікай пошуку, падарожжа, мараплавання як быцця, якое імкнецца пераадолець уласныя межы, выйсці за рамкі абмежаванага. Гэта Ноеў каўчэг – сімвал-алегорыя шчаслівага выратавання. Святыя айцы лічылі карабель увасабленнем царквы, якая праз мора гэтага свету бяспечна вязе хрысціян да вечнага прыстанку. Таму галоўная частка храма называецца

навою – караблём. Эмблематыка вызначае вобраз карабля як сімвал паспяховага дасягнення мэты.

Вобразная метафара «съсуд» у пропаведзі Тураўляніна («*чистии съсуди*» [4, с. 372]) ўтрымлівае ў сабе Слова Божае і сімвалізуе яго чысціню, бясконцасць, вечнасць. «Съсуд» упадабляецца душы, сэрцу, чалавеку ў цэлым як умясцілішчу пачуццяў.

Майстэрства Кірылы Тураўскага ў стварэнні шмат'яруснай семантыкі «Слова на Сабор…» яскрава выяўляецца на прыкладзе лічбавай сімволікі, зададзенай семантычнымі палямі «мудрасць» і «вечнасць». Разгледзім працэс сакралізацыі лічбы 318 – адзінай і цэнтральнай ў пропаведзі. 318 (колькасць рабоў Аўраама і затым – айцоў Нікейскага сабора) – гэта камбінацыя лічбаў 3 (тры), 1 (адзін) і 8 (восем), кожная з іх нясе сваю спецыфічную сэнсавую напоўненасць. Лічба адзін з'яўляецца сімвалам мудрасці і графічна абазначаецца кропкай. 1 – гэта пачатак, першаснае адзінства, стваральнік, сутнасць [5, с. 27].

Першай лічбай у біблейскай традыцыі з'яўляецца лічба тры і кваліфікуецца як дасканалая, графічна выражаецца трохкутнікам. Яна ўвасабленне множнасці, творчай сілы, стварэння і абнаўлення.

Сакральная лічба восем з'яўляецца сімвалам гармоніі, боскага правасуддзя, графічна выражаецца перавернутым знакам бясконцасці. У духоўным плане 8 – гэта мэта пасвячонага, які прайшоў сем прыступак ці Нябёсаў, і таму гэтая лічба – зноў набыты рай, а таксама ўзнаўленне і шчасце.

Таемны сэнс лічбы выкрываўся таксама пры дапамозе раскладання яе на меншыя лічбы з іх далейшым сімволіка-акравершавым тлумачэннем. Раскладанне ліку 318 дае 300 (тау), 10 (йота) і 8 (эта) і тлумачыцца так: «Літара "тау" ёсць вобраз Крыжа, … літара "йота" з'яўляецца акравершам Ісуса, … літара "эта" яўляе непахісны нораў дабрадзейнасці» [2, с. 39]. Валодаючы ўсім гэтым – а менавіта сакральным зместам, заключаным у гэтай лічбе – Аўраам, маючы 318 рабоў, якія нарадзіліся ў яго доме, адважыўся выйсці супраць ворагаў; 318 айцоў Нікейскага сабора выступілі ў абарону веры Хрыста. А мелі яны ўсеабдымнае вучэнне багаслоўя, заключанае ў лічбе 300, таінства Боскага ўвасаблення, заключанае ў лічбе 10, і дасканалы спосаб цвёрдага навыка ў дабрадейнасці, заключанага ў васьмёрцы.

Такая неадназначнасць суадносін у вобразнай структуры сімвалаў-алегорый прадметнага і ідэйнага планаў спрыяла найбольш поўнаму спасціжэнню сярэдневяковым слухачом (чытачом) сутнасці хрысціянства і ідэі непадзельнай цэласнасці светабудовы.

**Літаратура**

1. *Бауэр В., Дюмотц И., Головин С.* Энциклопедия символов / Пер. с немецкого Г. И. Гаева. Москва, 1995.

2. *Кириллин В. М.* Символика чисел Древней Руси (XI–XVI вв.) / В. М. Кириллин; [Рос. акад. наук, Ин-т мировой лит. им. А. М. Горького, О-во исследователей Древ. Руси]. СПб., 2000.
3. *Лихачев Д. С.* Поэтика древнерусской литературы. Ленинград, 1967.
4. *Мельнікаў А. А.* Кірыл, епіскап Тураўскі: Жыццё, спадчына, светапогляд / Навук. рэд. і аўт. прадм. В. А. Чамярыцкі; Акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. Мінск, 1997.
5. Полная энциклопедия символов / сост. В. М. Рошаль. Москва; СПб., 2006.
6. Словарь символов и знаков / Авт.-сост. Н. Н. Рогалевич. Минск, 2004.

## ЧЕРТЫ МАГИЧЕСКОГО РЕАЛИЗМА В РОМАНЕ ДЖОНА ФАУЛЗА «ВОЛХВ» («МАГ», «THE MAGUS», 1965)

**К. Власова**

Джон Фаулз (John Fowles, 1926–2006) вошел в историю литературы как один из крупнейших прозаиков XX века, оцениваемый критикой как самый интересный и важный талант послевоенного период.

В творческой мастерской автора гармонично сосуществуют произведения от философских эссе, рассказов и повестей до романов, которые, впрочем, были его излюбленным жанром. Поэтому можно с уверенностью утверждать, что Фаулз был писателем-экспериментатором. Как заметил сам писатель: «Я хотел бы написать по произведению в каждом из существующих жанров» [1, с. 13]. Тем не менее, все его произведения объединяет одно ключевое понятие: «обретение самосознания как необходимого условия для достижения свободы» [2, с. 4].

Творческое наследие Джона Фаулза довольно сложно уместить в рамки какого-либо одного литературного направления. В данном проекте творчество писателя будет рассматриваться как пример литературы «магического реализма».

Впервые термин «магический реализм» был употреблен немецким искусствоведом Францем Роо в отношении к искусству начала XX века. Сам автор называет данное течение **постэкспрессионизмом,** подчеркивая тем самым его тесную связь с экспрессионизмом. Необходимо отметить, что термин «магический реализм» имеет несколько вариантов. Так в лоне самого экспрессионизма зарождается новая тенденция к констатации фактов, «безэмоциональность», то есть так называемая «овещественность», или же Neue Sachlichkeit (новая вещественность) [2, с. 16, 17]. Содержание термина «Neue Sachlichkeit» выражает новый взгляд на мир; создается так называемая «трансцендентная предметность».

Теперь обратимся к самому роману Джона Фаулза «Волхв» и проведем своеобразное доказательство, что это произведение действительно может быть отнесено к «магическому реализму».